**Сутула, Г.** «Далёкая памяць заныла ў збалелай душы…» / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2011. — 16 лют. — С. 4.

## «ДАЛЁКАЯ ПАМЯЦЬ ЗАНЫЛА Ў ЗБАЛЕЛАЙ ДУШЫ…»

**Знаёмая з маладосці дарога штодня вядзе Міхаіла Лапу і Івана Ляўданскага на Пліскі льнозавод, які за дзесяцігоддзі стаў для абодвух родным. Але была ў жыцці гэтых працавітых, сціплых, добразычлівых людзей і іншая дарога: пад перакрыжаваным агнём душманаў, па набрынялым кроўю пяску, праз смерць, страх, слёзы, дарога, з якой так хацелася вярнуцца дамоў жывымі.**



Міхаіл Уладзіміравіч Лапа



Іван Вячаслававіч Ляўданскі

### «Всё равно победит доброта, потому что она человечна»

9 мая 1983 года. Падсвілле патанала ў белай кіпені садоў. Па вуліцах, пад гукі духавога аркестра, у святочнай калоне ішлі ветэраны. Ад ваенкамата пад «Развітанне славянкі» адпраўляліся на тэрміновую службу навабранцы, у ліку якіх быў і Міша Лапа. Цягнік узяў курс на Маскву. Для вясковага хлопца, які на той час далей Глыбокага нідзе не быў, адкрываліся неабсяжныя гарызонты і магчымасць пабачыць свет.

Праз шэсць месяцаў вучэбкі ў Ашхабадзе Міхаіл Лапа, які служыў у разведузводзе пяхотнага батальена, трапіў у Афганістан. Джалалабад сустрэў беларускага хлопца 60-градуснай спёкай, чужымі законамі і традыцыямі, варожасцю мясцовых жыхароў. Пасля двухмесячнай адаптацыі, яго перавялі ў Асад-Абад, што ў правінцыі Хунар. На сваім БМП-2 ён хадзіў у рэйды, суправаджаў

ваенныя калоны і гуманітарныя грузы. Былі баі сярод ночы, артабстрэлы, засады і страх, што чарговы бой можа стаць апошнім. У час адной перастрэлкі ў кроку ад Міхаіла ўзарвалася граната.

– Тады мяне кантузіла і рукі пасекла асколкамі. У шпіталі адбыў два тыдні і – зноў у строй, – успамінае Міхаіл Уладзіміравіч. – А вось саслужывец мой Саша Герко быў паранены ў галаву. Камандзір узвода сказаў, што ён загінуў.

Губляць сяброў, з якімі дзяліў і салдацкі паек, і службу ў экстрэмальных умовах, было цяжка.

1 мая 1985 года з медалём «За баявыя заслугі» Міхаіл Лапа перасек афгана-савецкую мяжу – яго дэмабілізавалі. Ад Ташкента да Падсвілля было амаль тры тысячы кіламетраў, але ўжо там з'явілася адчуванне роднага дому.

Пасля службы Міхаіл вярнуўся на Плiскі льнозавод, дзе і працуе да цяперашняга. Спачатку быў слесарам па сушылках, амаль два дзесяцігоддзі – мантажвікам унутраных санітарна-тэхнічных сістэм і абсталявання. Вытворчы працэс вывучыў ад «а» да «я», а таму і не дзіва, што менавіта ён стаў спецыялістам, які адказвае за бесперабойную работу сістэмы ацяплення, вентыляцыі, водаправода, каналізацыі і ачышчальных збудаванняў. Міхаіл Уладзіміравіч – чалавек адказны, руплівы, не цураецца ніякай работы. Ён і са сваімі абавязкамі спраўляецца, і гатоў прыйсці на дапамогу тым, у каго здараецца вытворчая праблема, і на нарыхтоўку льнотрасты едзе. А ў дадатак ён і спартсмен добры. Любіць валейбол. Пастаянна ўдзельнічае ў спартыўных турнірах. І як гаспадар спраўны: не ў кожнай жанчыны будзе такі парадак і ў доме, і на агародзе. Любімае хобі – рыбалка і грыбы. На ўлонні добра і адпачыць, і падумаць пра жыццё, у якім шмат прыемных і нечаканых сюрпрызаў. Адзін з іх – званок былога саслужыўца Сашы Герко, які летась адшукаў Міхаіла праз ваенкамат; таго самага цяжкапараненага Сашы, якога дваццаць пяць год Міхаіл лічыў нябожчыкам. А летась на Дзень Незалежнасці Міхаіл Уладзіміравіч пабываў на Востраве слёз у Мінску, дзе адбылася незабыўная сустрэча тых, хто прайшоў нялёгкімі ваеннымі дарогамі Афгана. І адчуў ён подых васьмідзесятых, плячо сяброў і аднадумцаў, і франтавое братэрства, якое, здалося, умацавалася за гады мірнага жыцця.

Міхаіл Уладзіміравіч – не філосаф і прыгожа гаварыць не ўмее, але ён перакананы, што сэнс жыцця ў дабрыні, якая ўпрыгожвае любую справу і самога чалавека, у дабрыні, якая перамагае войны і беды і ратуе свет ад раўнадушша, болю і чарнаты.

**«С годами всё привычней седина, которую дала тебе война»**

Тэрміновую службу Іван Ляўданскі пачынаў у легендарнай 103-й Віцебскай мотастралковай дэсантнай дывізіі. Там упершыню падняўся ў неба, зрабіў першы скачок з парашутам. Зямля з 900-мятровай вышыні здалася яму маленькай і безабароннай – яе хацелася ўзяць у далоні, захінуць ад непагадзі і абагрэць. Можа таму словы прысягі, якую салдат даваў у Пскове, былі напоўнены шчырасцю і жаданнем бездакорна несці службу на карысць Радзімы.

Салдацкі шлях Івана пралег праз Кабул да Шынданда, дзе знаходзілася ваенная база. Праўда, на ёй радавыя і афіцэры дэсантна-штурмавога батальёна бывалі рэдка, толькі калі вярталіся, каб адпачыць пасля выканання баявых заданняў. А яны былі не з лёгкіх: прачэсвалі гарады, высочвалі караваны душманаў, суткамі ляжалі ў засадах, суправаджалі грузы. За паўтара года службы Івану давялося пабываць і ў зімовым Афгане.

– У Фарах, які знаходзіўся на вышыні двух тысяч кіламетраў над узроўнем мора, ляжаў снег. Жылі ў палатках. Зброю і харчаванне дастаўляў самалёт. На вайне, як на вайне; прыходзілася

страляць у праціўніка. Але ў экстрэмальнай сітуацыі спрацоўвае інстынкт самазахавання: калі не паспею першым націснуць на курок я, расстраляюць мяне. Пасля бою сядзеў, а рукі трэсліся ад перажытага і ўбачанага, – расказвае Іван Вячаслававіч. – Калі адыходзіў у армію, мама дала мне кавалачак свянцонага хлеба і сказала, што я магу яго з'есці ў самую цяжкую жыццёвую хвіліну. Я насіў той хлеб у кішэні, спадзеючыся, што такога не здарыцца.

Гэты матулін абярэг, падмацаваны малітвай да Бога, умацоўваў дух салдата і даваў надзею на тое, што ўсё будзе добра. І ўсё ж падсцерагла ў жыцці Івана Вячаслававіча смяротная небяспека.

– У час артабстрэлу намеснік камандзіра акругі падняўся ў неба, каб адсачыць агнявыя пазіцыі душмалаў. Самалёт быў падбіты і ўпаў у цясніну. А цясніна тая плошчай 22 квадратныя кіламетры. У нас быў загад знішчыць праціўніка, знайсці абломкі самалёта і падняць цела камандзіра. Спусціліся мы ў цяснину, а душманы, якія парабілі ў скалах схованкі, вялі па нас перакрыжаваны агонь. Я адчуў, што з гэтага пекла жывым мала каму прыйдзецца выйсці, а таму і вырашыў з'есці той мамін хлеб.

Ён выйшаў з таго бою без адзінай драпіны і з таго часу верыць у лёс.

А склаўся ён у Івана Вячаслававіча, па яго словах, удала. Сустрэў сваё каханне, ажаніўся, вырасціў сына, мае ўнучку. Маленькая Надзейка падарыла дзядулю Івану (яму сёлета споўніцца пяцьдзесят), вялікую надзею на шчаслівае жыццё, у якім паўнапраўнай гаспадыняй будзе каляровае бесклапотнае дзяцінства.

Іван Вячаслававіч пайшоў па «бацькавых» слядах: працуе на Пліскім ільнозаводзе элетраманцёрам. Ён – член прафкама, актывіст культмасавага сектара, чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі, душэўны, спагадлівы чалавек. І такі сціплы, як і Міхаіл Лапа: абодва ўпершыню за дваццаць пяць год прыйшлі на сустрэчу са мной з баявымі ўзнагародамі.

*С годами забываются бои,*
*Спокойней снятся, словно не твои*
*Становится привычней седина,*
*Которую дала тебе война...*

Радкі са зборніка Віктара Верстакова «Палае горад Кандагар» і пра маіх герояў, у жыцці якіх было месца суровай ваеннай прозе, і ранняй сівізне, якая пасерабрыла іх скроні і ўпрыгожыла ўзрост.

**Галіна СУТУЛА**

**Фота Андрэя ПАНКРАТА**